# Родныя краявіды

**ПРАЛЕТАРСКАЯ, 82. Выстава Станіслава МАЛАШЧУКА «Прырода Беларусі: ад зубра да бусла» адбылася ў Мазырскай цэнтральнай бібліятэцы імя А. С. Пушкіна.**

СМОТРИТЕ ВИДЕО



**Асаблівая любоў *Станіслава Малашчука* – жывёлы.**



Станіслаў Малашчук нарадзіўся 24 лістапада 1958 г. у Мазыры. У 1976 г. паступіў у Рыжскае вышэйшае ваеннае вучылішча, пасля заканчэння якога служыў у вайсковай частцы Мазыра. Звольнены ў запас у 1992 г. у званні маёра.

У 1982 г. наведваў мастацкую студыю М. К. Дубровы, дзе асвоіў розныя віды графікі – афорт, гравюру.

З 1990 г. займаецца іканапісам. Першая ікона – «Георгій Пераможца» – была напісана алеем у 1991 г. Паступова перайшоў да традыцыйнай формы іканапісу тэмперай на дошцы.

Станіслаў Нікановавіч – адзіны ў Мазыры рэстаўратар абразоў і іншых прадметаў даўніны, гравюр. Ён даўно і заслужана набыў павагу ў асяроддзі калекцыянераў і знаўцаў мастацтва. Удзельнік мастацкіх выстаў з 1992 г. Працуе ў розных тэхніках, такіх як афорт, пастэль, акварэль, алей, тэмпера.

Старажытная храмавая архітэктура – яго «слабасць». Узіраючыся ў кожны з помнікаў старажытнасці, ён старанна ўзнаўляе цэласны вобраз мінулага. Мастак шмат падарожнічаў: пабываў у Архангельску, Волагдзе, Уладзівастоку, на Камчатцы і Каўказе. Аб'ездзіў і родную Беларусь. З падарожжаў прывозіў новыя ўражанні, частка якіх была прадстаўлена на выставе «Вандроўкі» ў 2023 г.

На выставе прадстаўлена 26 палотнаў, на якіх можна ўбачыць усю разнастайнасць жывёльнага свету нашай краіны. Шмат фактаў пра жыццё і паводзіны жывёл мастак агучыў, адказваючы на пытанні наведвальнікаў – калег і проста тых, хто цікавіцца мастацтвам.

На яго карцінах жывёлы выглядаюць як жывыя, і, як заўважыла адна з наведвальніц, у яго нават драпежнікі з добрым позіркам.

Адлюстраваныя з любоўю куткі прыроды на палотнах мазырскага мастака яшчэ раз нагадваюць нам, што Беларусь – дзіўная па сваёй прыроднай прыгажосці краіна.

**Марта МАРОЗ. Фота аўтара**

Мароз, М. Родныя краявіды / Марта Мароз // Жыццё Палесся. – 2026. – 17 сакавіка. - С. 10.